УДК 930(476)(477)

В. У. Коваль, старш. выкл., канд. гіст. навук (БДТУ, г. Мінск)

# ГЕНДЭРНЫ АСПЕКТ ГІСТОРЫІ МІЖВАЕННАЙ ЭМІГРАЦЫЙНАЙ ХВАЛІ З ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Даволі цікавым аспектам сучасных гендерных даследаванняў стала праца беларускіх і ўкраінскіх жанчын у эміграцыі. Варта падкрэсліць, што роля жаночага рух і ўплыў грамадскіх жаночых арганізацый на палітычнае жыццё дыяспар адрозніваліся ў розных краінах свету. Дыяспары ў міжваенны час намагаліся ўскласці на жаночы рух пэўныя гаспадарчыя, культурныя і палітычныя функцыі, якія садзейнічалі развіццю асяродкаў.

Украінская эміграцыя значна шырэй за беларусаў замежжа развіла дзейнасць жаночых аб’яднанняў. Разам з тым, беларускія эмігранткі таксама далучыліся сваёй працай да міжнароднага жаночага руху, пра што сведчаць архіўныя крыніцы міжваеннага часу. Адной з першых задач жаночых эміграцкіх суполак стала фарміраванне сталых сувязей з арганізацыямі жанчын іншых народаў, а таксама іх аб’яднанне для прадстаўлення нацыянальных інтарэсаў на міжнародным узроўні. Жаночыя суполкі замежжа аказвалі матэрыяльную і гуманітарную дапамогу, ачольвалі студэнтаў і дзяцей дыяспар, ладзілі культурныя мерапрыемствы і святы, праводзілі Дзень Маці, адчынялі сталоўкі, навучальныя ўстановы, музеі, бібліятэкі, пашыралі выдавецкую дзейнасць у рамках актыўнай культурна-асветнай працы, прымалі ўдзел у міжнародных кангрэсах і з’ездах. Асаблівай актыўнасцю вылучаліся жаночыя арганізацыі ўкраінскіх эмігрантак у Чэхаславакіі, Францыі, ЗША, Канадзе, Бразіліі і Аргенціне. У галіне адукацыі найбольш плённа і паспяхова працавалі ўкраінкі Канады. Негатыўна ўплывала на развіццё адзначаных арганізацый традыцыйнае сялянскае выхаванне і ўяўленне пра ролю жанчын у грамадстве. Разам з тым, прагрэсіўныя гендарныя ідэі не мінулі найбольш актыўных прадстаўніц дыяспары.

Пра факты супрацоўніцтва беларусак і ўкраінак замежжа сведчаць дакументы Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва. Эміграцкія жаночыя арганізацыі ладзілі агульныя мерапрыемствы, сустрэчы і канцэрты. Прыкладам супольнай акцыі стала вечарына ў Парыжы, праведзеная ў снежні 1938 г. Беларускай жаночай грамадой разам з Украінскай жаночай грамадой і Украінскім працоўным саюзам.